# Феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў (IX—XI стст.)

Працэс станаўлення дзяржаўнай улады ў розных рэгіёнах Усходняй Еўропы стаў вынікам складаных этнічных і сацыяльна-эканамічных працэсаў. Пачатковая гісторыя Полацкага княства не выключэнне. Вывучэнне дзяржаватворных працэсаў на абшарах Беларускага Падзвіння ў пераломны момант этнічнай гісторыі ўяўляе вялікую цікавасць для гісторыка.

Мэта артыкулу — рэканструкцыя шляхоў станаўлення сярэднявечнай дзяржавы — Полацкага княства на фоне этнакультурных працэсаў Усходняй Еўропы IX—XI стст.

За аснову дэтэрмінізацыі паняцця «дзяржава» намі прынята вызначэнне Язэпа Юхо[1]. Дзяржава — гэта тэрытарыяльны, суверэнны хаўрус грамадзянаў, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды і маёмасці. Яе дзейнасць рэгламентуецца прававымі нормамі і правіламі маральных паводзінаў, выкананне якіх забяспечваецца сістэмай кіравання і выхавання. У вызначэнні сутнасных характарыстык дзяржавы ў раннім сярэднявеччы мы прымаем за аснову тры галоўныя адзнакі: 1) размяшчэнне насельніцтва па тэрытарыяльнай прыкмеце, а не на аснове кроўнародных сувязяў; 2) наяўнасць дзяржаўнай улады, якая аддзелена ад асноўнай масы народу; 3) абкладанне падаткамі для ўтрымання яе прадстаўнікоў[2].

Для абазначэння дзяржавы на Русі выкарыстоўвалася некалькі тэрмінаў: «зямля», «воласць», «отчізна», «жізнь», «улада» і інш. Найбольш ёмістыя азначэнні дзяржавы — «зямля» і «воласць». Зямля — гэта вышэйшы сымбаль дзяржаўнай улады, распаўсюджаны на пэўную тэрыторыю і яе свабоднае насельніцтва. У адрозненне ад «зямлі», «воласць» магла



Полацк у XII–XIII стст. Рэканструкцыя В. Сташчанюка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Рэканструкцыя першапачатковага выгляду св.Сафіі ў Полацку. Сярэдзіна XI ст.

пазначаць усякую вобласць як у значэнні цэлай дзяржавы, так і яе адміністрацыйных адзінак[3]. Упершыню воласць на чале з Полацкам згадваецца ў 862 г., калі ў ёй пачаў княжыць набліжаны (муж) князя Рурыка. Як слушна заўважае Георгій Штыхаў, паведамленне засведчыла існаванне Полацка як цэнтра пэўнай воласці, якая мела дзяржаўныя атрыбуты яшчэ да запрашэння варагаў на княжанне[4].

У працэсе станаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях нельга не заўважыць наступнай акалічнасці. У раннім сярэднявеччы існавалі два асноўныя рэгіёны, якія маглі стаць самастойнымі дзяржаўнымі ўтварэннямі. Першы — Беларускае Палессе, тэрыторыя рассялення дрыгавічоў. Варта ўзгадаць, што традыцыі развіцця славянскай культуры на правабярэжжы ад Прыпяці прасочваюцца з V ст., а ў святле археалагічных адкрыццяў апошніх гадоў — з IV ст.[5]. За пяцьсот гадоў да X ст. тут змяніліся тры археалагічныя культуры, якія належалі славянам: пражская, Лукі Райкавецкай і археалагічная культура дрыгавічоў. Другім рэгіёнам, які адыграў дамінантную ролю ў стварэнні дзяржаўнасці на беларускіх землях, стала Беларускае Падзвінне з адносна маладой славянскай культурай (IX ст.).

Полацк згадваецца на старонках летапісаў у 862 г., тады як палітычную гісторыю Тураўскай зямлі правамоцна разглядаць з 980 г.[6]. Да X ст. Полацк замацаваў за сабой ролю палітычнага лідэра не толькі ў Падзвінні, але і на абшарах Беларусі.

Узнікае пытанне: чаму менавіта славянская (крывіцкая) культура Беларускага Падзвіння стала асновай **першага** дзяржаўнага ўтварэння на беларускіх землях? У адказе на гэта пытанне і карэніцца сутнасны феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў.

Этнакультурная сітуацыя на Беларускім Падзвінні на момант з'яўлення славянаў была няпростая. На VIII ст. прыходзіцца час згасання тушэмлінскай культуры Верхняга Падняпроўя (па ўдакладненай храналогіі Е.А. Шміта)[7]. Верхняя храналагічная мяжа распаўсюджвання старажытнасцяў банцараўскай культуры ў Беларускім Падзвінні прыпадае на канец VIII — пачатак IX стст.[8]. Менавіта ў гэты час у рэгіёне фарміруецца культура доўгіх курганоў Паўночнай Беларусі (г. зв. другая стадыя культуры доўгіх курганоў Падзвіння)[9], асноўнымі носьбітамі якой, на думку большыні даследнікаў[10], былі славяне. У суседнім Верхнім Падняпроўі гэты працэс суправаджаўся пагібеллю ў агні гарадзішчаў-сховішчаў тушэмлінскай культуры, пасля чаго жыццё на пасяленнях, як правіла, не аднаўлялася[11]. На Падзвінні, дзе агульная колькасць гарадзішчаў-сховішчаў банцараўскай культуры вылічваецца некалькімі дзесяткамі, да апошняй трэці I тыс. жыццё працягваецца на адзінкавых пасяленнях каля в. Свіла-І, Віцебска, Лукомлі і некаторых іншых.

Паходжанне дзяржаўнасці ва Усходняй Еўропе звязана з фактарам урбанізацыі. Полацк — адзіны летапісны горад, за якім у сучаснай гістарыяграфіі надзейна замацавалася вызначэнне «калыска беларускай дзяржаўнасці». Рэканструкцыя працэсаў станаўлення Полацка як палітычнага і адміністрацыйнага цэнтру полац-



Дзяўчына з заможнай сям'і. XII ст. Рэканструкцыя. Мастак Алесь Пушкін.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кіх крывічоў прапанаваная вядомымі беларускімі навукоўцамі Георгіем Штыхавым, Эдуардам Загарульскім, Сяргеем Тарасавым.

Так, паводле Г. Штыхава Полацк узнік як племянны цэнтр крывічоў-палачанаў, апорная цвердзь у працэсе славянізацыі краю. С. Тарасаў выказаў меркаванне, што Полацк мог быць заснаваны роданачальнікам Крывам, правадыром адной са славянскіх груповак[12]. На думку Э. Загарульскага, Полацк абавязаны ўзнікненнем свайму асабліваму палітычнаму і сацыяльна-эканамічнаму статусу, паколькі адна толькі функцыя ваенна-адміністрацыйнага падпарадкавання балтаў не тлумачыць прычыну паходжання гораду. У якасці прыкладу аўтар прыводзіць рэгіён Беларускага Пасожжа, дзе этнічная сітуацыя на момант рассялення славянаў была не менш складаная, чым на Падзвінні, аднак гарадоў там не ўзнікла[13].

Пазначаныя канцэпцыі не ўзаемавыключальныя. Агульнае ў іх — што Полацк з'яўляўся племянным цэнтрам крывічоў. Аднак нельга не пагадзіцца з Э. Загарульскім аб асаблівым сацыяльна-эканамічным, а галоўнае — палітычным статусе Полацка як асноўным чынніку яго ўзнікнення. Менавіта гэты статус забяспечваў стабільнае развіццё гораду на працягу доўгага перыяду яго станаўлення як дзяржаватворчага цэнтру.

З прыведзенага вынікае пастаноўка навуковай праблемы: якому асабліваму статусу Полацк абавязаны сваім паходжаннем?

Першыя дзяржаватворчыя цэнтры Русі на чале з Ноўгарадам знаходзіліся ў паўночным рэгіёне (чатырохкутнік азёраў Ладажскае, Анежскае, Белае, Ільмень, Чудскае). Пад 862 г. у Лаўрэнцьеўскім летапісе знаходзім паведамленне пра раздачу Рурыкам гарадоў сваім васалам: «овому Полотескъ, овому Ростовъ другому Белоозеро и по тем городам суть находници врязи, а первые насельници в ... Полотьски кривичи...»[14]. Імперыя Рурыка прасціралася ў паўночным рэгіёне ўсходнеславянскага свету з цэнтрам у Ноўгарадзе, сталіца была перанесена ў Кіеў толькі падчас праўлення Алега (882). Адначасова пачалося і пераразмеркаванне палітычных сувязяў, якія наклалі адбітак на далейшую гісторыю Полацкага княства. Варта ўзгадаць, што асноўная мэта паходу Уладзіміра на Полацк у 980 г. была нейтралізацыя Рагвалода як хаўрусніка кіеўскага князя Яраполка. «Абранне» Рагнедай[15] Яраполка адпавядала палітычным інтарэсам Полацка ў нейтралізацыі галоўнага канкурэнта ў балтыйскім гандлі — Ноўгарада. Гэтай жа прычынай тлумачыцца палітычная актыўнасць полацкіх князёў Брачыслава Ізяслававіча і Усяслава Брачыслававіча (паходы на Ноўгарад у 1021, 1066 і 1069 гг.).

Нельга пагадзіцца з думкай, што Полацк узнік выключна як гандлёвы цэнтр. Прыклад старажытнага Гняздова пераканаўча сведчыць, што адасабленне гандлёва-рамесных і дружынных групаў на падставе абслугоўвання патрабаванняў, галоўным чынам, знешняга гандлю хоць і суправаджаецца кароткачасовым росквітам, яшчэ не з'яўляецца дастатковым для перарастання такога цэнтру ў раннесярэднявечны горад[16]. Акрамя таго вядома, што знакаміты шлях «з варагаў у грэкі» ў IX ст. толькі пачынае функцыянаваць, актыўнае яго выкарыстанне прыпадае на X—XII стст.[17]. На тэрыторыі Беларусі знойдзены ўсяго чатыры скарбы другога перыяду абарачэння дырхема (830—900), большасць іх знаходак належыць да X—XII стст.[18].

Дзяржаўнасць і інстытуты ўлады існавалі на землях славянаў яшчэ да запрашэння варагаў на чале з Рурыкам. Гэты факт сведчыць пра наяўнасць першаснага ўласна славянскага этапу фармавання крывіцкае дзяржаўнасці. На момант рассялення на Падзвінні славяне знаходзіліся на стадыі ваеннай дэмакратыі, якую можна акрэсліць як пераддзяржаўнае ўтварэнне саюзаў плямёнаў з тэндэнцыяй да іх адзінаначальнага кіравання. Вынік развіцця Полацка на дадзеным этапе — гэта ягонае станаўленне як палітычнага і адміністрацыйнага цэнтру крывічоў-палачанаў, асяродак кшталтавання урбаністычнай славянскай культуры IX ст. Пачатковая функцыя княжацкай улады — гэта кіраўніцтва працэсамі славянскай каланізацыі Падзвіння, і менавіта ёй, на нашу думку, Полацк і абавязаны сваім узнікненнем.

У іншых публікацыях было адзначана, што на ўсіх пачатковых протагарадскіх пасяленнях на тэрыторыі Беларускага Падзвіння (Віцебск, Лукомль, Свіла-1) на момант прыходу славянаў жыло аўтахтоннае балцкае насельніцтва[19]. Полацк у гэтай сітуацыі — выключэнне. Асабліва важным падаецца, што на Першапачатковым полацкім гарадзішчы (таксама як і на паселішчы) не зафіксаваны пласт банцараўскай культуры VI—VIII стст., а гэта азначае, што гарадзішча пры вусці Палаты

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Замах Рагнеды Рагвалодаўны на жыццё мужа, князя Уладзіміра. Мініятура Радзівілаўскага летапісу.

на працягу сама меней трох стагоддзяў не было заселена.

У гэтай сувязі хацелася б звярнуць увагу на адну прыкрую недакладнасць: на старонках найноўшых акадэмічных выданняў Першапачатковага гарадзішча ўнесена ў лік помнікаў банцараўскай (балцкай ці балта-славянскай) культуры[20]. Падставай для такога меркавання стала публікацыя Г. Штыхавым[21] і С. Тарасавым[22] фрагментаў ляпной керамікі з полацкага гарадзішча і паселішча. Сярод гэтых фрагментаў два венцы падобныя на банцараўскую кераміку, пры гэтым адно венца з'яўляецца пад'ёмным матэрыялам, г. зн. яго дачыненне да культурнага пласту вельмі верагоднае[23].

Мусім падкрэсліць, што без наяўнасці культурнага пласта знаходжанне адзінкавых фрагментаў банцараўскай керамікі сведчыць аб балта-славянскіх кантактах у памежнай зоне рассялення славянскага этнасу, у якой знаходзіўся Полацк на раннім этапе свайго існавання.

Паводле археалагічных матэрыялаў, Полацк быў заснаваны на мяжы VIII—IX стст.: знойдзены датуючыя матэрыялы па гэтаму перыяду з Полацкага паселішча (буйныя фрагменты ляпной керамікі пражскага тыпу, а таксама фрагменты керамікі, тыповай для доўгіх курганоў VIII—IX стст.[24]). Некаторыя фрагменты посуду, на думку Г. Штыхава, маюць роменскія аналагі. Несумненна адно — найбольш раннія ўзоры посуду з Полацкага паселішча з'яўляюцца славянскімі паходжаннем.

Пагорак, на якім адбылося будаўніцтва Полацкага замчышча[25], дагэтуль прыкладна на працягу трох стагоддзяў не быў заселены[26]. Найбольш раннія матэрыялы — сведчанні з'яўлення славянаў — былі знойдзены на Полацкім паселішчы, таму цалкам верагодна, што менавіта на ім першапачаткова было адноўлена жыццё. Паралельна з асваеннем паселішча (славяне ў першую чаргу былі земляробы) ідзе працэс умацавання гарадзішча — насыпаецца вал, будуецца замкавая сцяна, узводзіцца сістэма абарончых збудаванняў[27]. Магчыма, у гэты час у Полацку ўсталёўваецца свой пантэон язычніцкіх багоў[28]. Такія буйнамаштабныя мерапрыемствы былі магчымы пры наяўнасці дастаткова распрацаванай сістэмы кіруючага апарату. Яго функцыянаванне забяспечвала княжацкая ўлада, якая абапіралася ў сваіх дзеяннях на племянную знаць. Таму цалкам слушным падаецца меркаванне, што этнонім «крывічы» паходзіць ад імя роданачальніка Крыва, асноўны род якога выбраў месцам свайго сталага жыхарства Полацк[29].

На нашу думку, Полацк быў заснаваны ў выніку дагаворных дачыненняў паміж славянамі і балтамі на ўзроўні племяннога кіравання, таму ён адразу пачынае вылучацца палітычнай актыўнасцю. Ініцыятыва пры гэтым належала славянскім пасяленцам. Незаселенае гарадзішча давала крывічам выдатную стартавую магчымасць у пабудове ўласнай дзяржавы і паступова да славянаў пераходзіць кіраўніцтва ўсімі сферамі грамадска-палітычнага жыцця ў рэгіёне. Індыкатарам гэтага працэсу ёсць сведчанні летапісаў і скандынаўскіх сагаў.

У балцкага насельніцтва да прыходу славянаў, відаць, меліся свае племянныя цэнтры, якія аб'ядноўвалі асобныя субрэгіёны. Магчыма дапусціць, што імі з'яўляліся старажытныя Віцебск і Лукомль. Працяг іх існавання пасля прыходу славянаў натуральны, паколькі заключэнне дагаворных стасункаў павінна было вырашацца не ніжэй, чым на ўзроўні племяннога кіравання. Як вынік, у IX—X стст. у Віцебску і Лукомлі археалагічна фіксуюцца артэфакты славянскай культуры.

Такім чынам, першапачатковы сацыяльны статус Полацка — племянны цэнтр крывічоў-палачанаў, рэзідэнцыя мясцовай адміністрацыі, аднак палітычная роля Полацка ставіла яго ў больш прыдатнае становішча ў параўнанні з іншымі гарадамі Беларускага Падзвіння. Полацк, як носьбіт атрыбуту дзяржаўнай улады (рэзідэнцыя княжацкай адміністрацыі), адыгрываў ролю пасрэдніка і каардынатара міжэтнічных, хаўрусных балта-славянскіх дачыненняў, забяспечваючы роўныя правы абодвух бакоў у пабудове новага дзяржаўнага ўтварэння — Полацкага княства. Гэтая функцыя і забяспечвала гораду асаблівы сацыяльны

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

статус на першасным этапе яго існавання.

Паступовa да XI ст. склаліся асноўныя інстытуты дзяржаўнай улады зямлі-княства (князь, дружына, веча, баяры і інш.)[30], тады ж Полацк стаў горадам у сацыяльна-эканамічным разуменні гэтага тэрміна[31].

Падчас праўлення Брачыслава Ізяслававіча палачане праводзяць самастойную палітыку ў дачыненні да сваіх заходніх балцкіх суседзяў. Менавіта ў выніку гэтай дзейнасці былі заснаваны гарады Браслаў, Маскавічы, Рацюнкі, Дрысвяты. У першай палове XI ст. фіксуюцца археалагічныя сведчанні ваенных сутыкненняў паміж крывічамі і заходнімі суседзямі-балтамі на Падзвінні[32]. На працягу XI ст. працэс славянізацыі балтаў яшчэ не быў завершаны (па курганных пахаваннях бачна, што сельская акруга заставалася пераважна балцкай[33]), таму ўзнікненне памежных дзяржаўных цвердзяў можна разглядаць як рэальнае праяўленне палітычнай волі палачанаў і іх князя. Полацкія крывічы XI ст. былі ўжо палітычна з'яднаны, з гэтай прычыны ўжыванне палітоніму «палачане» ў дачыненні да ўсіх жыхароў Полацкае зямлі падаецца слушным.

Палітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе пачатку II тыс. прадвызначыла распаўсюджванне хрысціянскай ідэалогіі з яе ідэямі монацэнтрызму. Славяне, носьбіты урбаністычнай традыцыі, сталі непасрэднымі праваднікамі новай хрысціянскай ідэалогіі. Самыя раннія сведчанні пра хрысціянаў з ліку мясцовай княжацкай дынастыі звязаны з імем Ізяслава Уладзіміравіча і ягонай маці Рагнеды[34]. Варажскае паходжанне полацкіх князёў Рагвалодавічаў у



Св.Канстанцін і Алена. Абразок XII ст. з археалагічных знаходак Г.Штыхава ў Полацку ў 1967 г.

гэтым выпадку не пярэчыць выказанаму меркаванню, паколькі яны дзейнічалі ў інтарэсах славянскага насельніцтва крывічоў-палачанаў. Напрыканцы X ст. у Полацку праводзілася місіянерская дзейнасць Торвальда, які заснаваў у горадзе манастыр і быў пахаваны ў крывіцкіх землях Падзвіння[35].

Хрысціянізацыя Полацкай зямлі была абумоўлена патрэбай княжацкай улады ва ўпарадкаваным кіраванні новымі тэрыторыямі. Хрысціянізацыя была гістарычна дэтэрмінавана наяўнасцю шматлікіх культурных сувязяў з Візантыяй, таму распаўсюджванне новай веры ў Полацкай зямлі звязана з дзейнасцю Рагвалодавічаў і пачаткова мела акрэслены палітычны характар. На тэрыторыі Полацкай зямлі новая рэлігія распаўсюджвалася мірным шляхам, у адрозненне, напрыклад, ад Тураўскай зямлі, дзе мелі месца крывавыя сутыкненні[36]. Палітыка асіміляцыі палачанамі балтаў і распаўсюджванне хрысціянства на Падзвінні мелі падабенства ў галоўным: новая рэлігія і новая культура (у першую чаргу урбаністычная), сталі асноўнымі атрыбутамі **дзяржаўнай** улады полацкіх крывічоў.

Археалагічныя раскопкі пацвердзілі, што на месцы Полацкай Сафіі, узведзенай паміж 1050—1055 гг., існавала драўляная пабудова, якая загінула ў моцным пажары[37]. Цалкам верагодна, што на месцы Сафіі раней знаходзілася царква св. Багародзіцы, якая згадана пад 1001 і 1007 гг. у сувязі з пераносам парэштkaў полацкіх князёў Ізяслава Уладзіміравіча і ягонага сына Усяслава[38].

Пачаткі манументальнага дойлідства, узвядзенне сабораў у Кіеве, Ноўгарадзе і Полацку можна разглядаць як акт палітычны. Культурнае «спазненне» суседніх прыбалтыйскіх фінскіх і балцкіх плямёнаў, у прыватнасці, адсутнасць у іх традыцыяў уласнага горадабудаўніцтва, тлумачыцца ў тым ліку і аддаленасцю ад хрысціянскай цывілізацыі. Невыпадкова першыя манументальныя пабудовы на землях усходніх славянаў звязаны з хрысціянскімі цэрквамі, таму і наяўнасць мураванага дойлідства — адна з вызначальных прыкметаў для атаясамлівання раннегарадскога пасялення з сярэднявечным горадам[39].

Працэс славянізацыі балцкага насельніцтва полацкай акругі шмат у чым быў сінхронны распаўсюджванню хрысціянства, таму і ў XII ст. двухвер'е было звычайнай з'явай. У славянаў-крывічоў існавалі як цераспалосныя, так і змешаныя з балтамі пасяленні. Нават у непасрэднай акрузе Полацка (Рудня, Дзмітраўшчына) касцюм жыхароў сельскіх пасяленняў у XI—XII стст. заставаўся балцкім[40].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Фібулы часоў Полацкага княства.

Неаднолькавасць этнічнага складу насельнікаў Полацкай зямлі магла ўскосна садзейнічаць негвалтоўнаму распаўсюджванню хрысціянства. Паводле археалагічных крыніцаў, у X—XI стст. мела месца значнае перамяшчэнне балцкага (яцвяжскага) насельніцтва з Панямоння ў межы Полацкае зямлі[41]. Невыпадкова язычнікі-балты, якія беглі ад нападаў крыжакоў і ўціску Лівонскага ордэну, знайшлі прытулак у Полацкай зямлі, пры гэтым летапісныя крыніцы не фіксуюць якіх-небудзь зменаў у рэлігійнай ці ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Полацкай зямлі.

Так у XI ст. з культурнага асяродку створаных крывічамі гарадоў паступова пачалі распаўсюджвацца хрысціянскія культы. Гэты працэс закрануў як славянскае, так і балцкае насельніцтва Полацкай зямлі, і праходзіў вельмі марудна: пісьмовыя крыніцы сведчаць пра язычніцкае веравызнанне сярод часткі славянскага насельніцтва суседняй Аршаншчыны нават у XVII ст.[42].

Асіміляцыя славянамі балцкіх плямёнаў доўжылася на працягу некалькіх пакаленняў, таму ўяўляецца больш правільным гаварыць пра біэтнічную балта-славянскую дзяржаву полацкіх крывічоў, прынамсі, на перыяд IX—X стст. Полацк, як носьбіт дзяржаўнай улады (рэзідэнцыя княжацкай адміністрацыі), адыгрываў ролю пасрэдніка і каардынатара міжэтнічных балта-славянскіх дачыненняў і забяспечваў роўныя правы абодвух бакоў у пабудове Полацкага княства. Гэтая функцыя забяспечвала Полацку правы на палітычнае лідэрства ў рэгіёне.

Такім чынам, станаўленне самастойнага дзяржаўнага ўтварэння — Полацкага княства — у IX—XI стст. адбывалася ў два этапы. Першы этап пачынаецца з моманту заснавання на мяжы VIII—IX стст. крывічамі Полацка як моцнага племяннога і рэгіянальнага цэнтру, ядра будучага княства. Другі этап — ад уваходжання Полацка ў палітычны хаўрус славянскіх і варажскіх плямёнаў паўночнай Русі на чале з Ноўгарадам (862—882 гг.) і Кіевам (882—912 гг.)[43] да канца XI ст. (усталяванне ў Полацку самастойнай дынастыі князёў Рагвалодавічаў з апошняй трэці X ст.).



Залаты бранзалет з Полацка.

Увогуле, гэты даволі цьмяны ў плане палітычнай гісторыі перыяд IX—XI стст. не вылучаўся стабільнасцю. Першы, «ананімны», этап гісторыі Полацка вельмі важны для разумення сутнасці станаўлення дзяржаўнай улады славянаў-крывічоў на Падзвінні. На другім этапе выразна адзначаецца тэндэнцыя да палітычнага сепаратызму Полацкай зямлі адносна Ноўгарада і Кіева, што асабліва праявілася ў XI ст. У гэты час Полацкае княства пераўтварылася ў моцную самастойную раннефеадальную дзяржаву з усімі атрыбутамі дзяржаўнай улады.

**ЗАЎВАГІ**

[1] Юхо Я. Дзяржава // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6-ці т. Т. 3. — Мн., 1996. — С. 237.

[2] Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. — Мн., 2002. — С. 8.

[3] Пузанов В. Народ и власть в городах-государствах Древней Руси // История России: народ и власть. — СПб., 1997. — С. 57; Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. С. 43—46.

[4] Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. С. 11.

[5] Вяргей В., Трымер В. Раннеславянскае паселішча Петрыкаў-2 на р. Прыпяць // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2003, № 18; Гавритухин И. Хронология пражской культуры Белорусского Полесья // Тамсама.

[6] Лысенко П. Туровская земля IX—XIII вв. — Мн.,1990. — С. 15—16.

[7] Шмидт Е. Проблемы хронологии тушемлинской культуры в Верховьях Днепра // Археалогія і старажытная гісторыя Магілёўшчыны і сумежных тэрыторый. — Магілёў, 1994. — С. 108—110.

[8] Митрофанов А. Археологические памятники восточных балтов на территории Белоруссии в эпоху железа (VIII в. до н. э. — IX в. н. э.) // Из древнейшей истории балтских народов. — Рига, 1980. — С. 108.

[9] Штыхаў Г. Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. — Мн., 1992. — С. 49—50.

[10] Енуков В. Ранний этап формирования Смоленско-Полоцких кривичей (по археологическим материалам). — М., 1990. — С. 173; Седов В. Восточные славяне в VI—XIII вв. — М., 1982. — С. 53—58; Шмидт Е. Тушемлинская культура на Верхнем Днепре и формирование смоленско-полоцких кривичей // Северная Русь и её соседи в эпоху раннего средневековья. — Л., 1982. — С. 102; Штыхаў Г. Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. С. 61.

[11] Третьяков П., Шмидт Е. Древнейшие городища Смоленщины. — М.—Л., 1963. — С. 41.

[12] Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. С. 18.

[13] Загорульский Э. Древняя история Белоруссии: автореф. дисс. ... доктора ист. наук. — М., 1983. — С. 27.

[14] ПСРЛ. Т. 1. — М., 1962. — Стб. 20.

[15] Насамрэч відавочна, што рашэнне прымаў Рагвалод, зыходзячы са знешнепалітычных рэаліяў таго часу.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова